БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА

Цана нумэру 50 кап.

Выходзіць тройчы у тыдзень.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Вільня, Востра-Брамская, № 9.

Год I. Серада, 14 мая 1919 г. № 8.

Вільня, 13-го мая 1919 г.

Фронт адсунуўся далёка на ўсход ад Вільні, а тое, што можна было даравацъ за яго блізкасьць, яшчэ і дагэтуль баліць нам.

Нам баліць, што мы ня маем зносін з Радаю Беларускай Рэспублікі і гэтым самым не забасьпечаны ад уселякіх неспадзеваных крыўдаў.

Калі маленькія цёмныя людзі вобмацкам знайшлі і арыштавалі німа ведама за што нейкага *беларуса* Яна Станкевіча, Віленская Беларуская Рада не магла адбіць тэлеграмы прадстаўнікам Беларускай Рэспублікі і пану Начальніку і беларускаму прыхільніку Юзэфу Пілсудскаму, каб нашага вядомага дзеяча выпусьцілі з турмы.

Усё вялікшыя і вялікшыя абшары беларускай зямлі выходзяць с-пад расейска-бальшавіцкай няволі. і усё болей баліць нам, што беларускі народ пакуль што можаць толькі маўчаць.

Ужо польскія чарнасотнікі ў сваіх газэтах далучылі Беларусь да Польшчы, а мы ня маем магчымасьці паведаміць аб гэтым сваіх прадстаўнікоў па-за межамі Беларусі і сваіх землякоў-сялян. З другога боку і нашы браты і бацькі ня могуць падаць нам свайго голасу, голасу усей грамады з вёскі у Вільню.

Дрэнна трапілася нашай вясковой грамадзе. Панаехалі з Масквы бальшавікі і пачалі адбіраць хлеб, забіраць хлопцаў у чырвоную армію і заганяць усіх у „комунію“ на панскай зямле. Польскае войска, дзякаваць Богу, зволіла яе ад бальшавіцкіх камісараў, а яго генэралы сказалі навет некалькі слоў аб роўнасьці і вольнасьці, а далей — а ні славечка! Паны, відаць, надта с таго уцешыліся і палезьлі у вялікую палітыку, каб ізноў зрабіць паншчыну, панскі прыгон, і ізноў ніхто і пальцам ня кіўнуў паном, што дрэнна робяць, што ня толькі шкодзяць сабе. але паслугуюць усей Польшчы, як мядзьведзі, і ужо нам бадай трэба сказаць паном: „Ой, паны. ня тыя часы! Навекі сканала вашая паншчына!“

Гэтая бяда — ня бяда, бо сяляне у зямельным пытаньню сьвядомы аж надта і здолеюць выгнаць спаміж сябе гультаёў і разбойнікаў, здолеюць і с панамі разабрацца не па-хуліганску, а як мае быць.

А вось беда — беларускае войска. Беларусы могуць служыць толькі у нацыянальным войску; нягожа нам у розных паноў рукі палавацъ. Хавацца нам няма чаго: толькі нашае нацыянальнае войска абароніць нашыя нацыянальныя і клясавыя патрэбы, абароніць зямлю і волю, непадзельнасьць і незалежнасьць Беларусі.

І мы ніколі ад гэтага не адступімся.

Дык каб мець пасьпех; нам трэба дбаць, клапаціць, рупіцца і працаваць. Спаць ня можна — іначай будзем няшчасны надоўга.

Пакуль трэба усёй грамадою пісаць пастановы, што мы, каталікі і праваслаўныя, пойдзем толькі у сваё беларускае войска.

Трэба дабівацца зносін з прадстаўнікамі Беларускай Рэспублікі і магчымасьці арганізавацца, каб падаць голас аб сваіх патрэбах.

Вольная трыбуна.

Спор за Вільню.

Раз трі богини спорить стали...

Акупацыя Вільні і Віленшчыны польскім войскам зрабіла яшчэ гастрэйшым і так ужо гострае пытаньне, каму валадаць Вільняю і прылегаючымі да яе землямі.

Былая сталіца Вялікага Князьства Літоўскага у цяперашні час, як капрысная прыгажуньня, зрабілася прынадаю ля некалькіх народнасьцяў: палякоў, беларусаў і літоўцаў.

Палякі, нядаўна заваладзеўшыя Вільняю, цьвёрда даводзяць, што гэта іхнае места, дзеля таго што у Вільні і бліжэйшых ваколіцах пануе *польская* культура, што Вільня—места Міцкевіча, Сыракомлі і інш., што Вільня—польскія Ахвіны, сталіца польскіх мудрацоў і паэтаў, і, нарэшце, што у Вільні большасьць насяленьня—*палякі, калі ня лічыць* жыдоў. Каля Вільні таксама жывець досыць многа палякоў.

Усё гэта, разам узятае, даець палякам грунт вымагаць — ці безумоўнага далучэньня Вільні і яе зямель да Польшчы, ці гарантыраваньня за Польшчаю асобных правоў на Вільню, калі яна застанецца па-за межамі польскага гасударства.

Палітыкі апошняга кірунку маюць нахіл да палітычнай вуніі паміж Польшчаю, Літвою і Беларусьсю; калі гэта спраўдзіцца, — Польшча, без сумненьня, будзе мець у Вільні цьвёрда трываючы падмурак пад свой культуральны і палітычны уплыў на Літву і Беларусь.

А да праўды, і аннексяністы і вуніяністы, разхадзяся ў спасабох кіраваньня да мэты, сходзяцца ў самай мэце, г.-ё. пад тым ці іншым соусам палякі розных палітычных кірункаў хочуць адстоіць Вільню ля Польшчы.

Пераходзім да пагляду ліцьвіноў.

Ліцьвіны і слухаць ня хочуць аб далучэньню Вільні да Польшчы. Як яны уважаюць, Вільня ня толькі павінна быць аддадзена Літве, але і стаць, як у старыну, сталіцаю Літоўскага гасударства, у склад якога, апроч ўласнай—этнаграфічнай Літвы павінны увайсьці і долі беларускай зямлі а іменна: часткі Гродзенскай, Сувалкскай, Віленскай і Ковенскай губэрніяў. Ліцьвіны пры гэтым цьвёрда доводзяць, што яны з беларусамі ужо маюць згоду у гэным пытаньню*).

Канечня, пакуль ня можа быць і гутаркі аб сур'ёзнай згодзе двух народаў—суседаў, катарым, быць можа, і наканавана зрабіць некалі новую шчыльную сувязь.

Сярод часткі беларусаў ёсьць выразна адзначаная плынь на карысьць вуніі з Літвою, але да згоды, вяжучай абодвы бакі, дзела яшчэ не дайшло. А калі так, дык цікава азначыць пагляд дужа пераважнай большасьці беларусаў на тое, да каго павінна належаць Вільня з землямі.

Беларусы меней усяго крычаць аб сваіх правох на Вільню, але гэта зусім ня значыць, што яны адмаўляюцца ці ня могуць абараніць свае правы на яе і аблегаючую яе зямлю.

Трудныя гістарычныя перабываньні беларусаў, край каторых на працягу некалькіх вякоў быў полем змаганьня, дзьвюх болей дужых нацыянасьцяў: маскоўцаў і палякоў, зьнядужылі нацыянальную энэргію беларусаў, ад каторых пачалі адськеплядца самыя каштоўныя, самыя жывучыя элементы і йсьці у рады байцоў таго ці гэнага лагера.

Русіфікацыя і палёнізацыя цьвілі на Беларусі буйней, чымся абы-дзе у другім мейсцу, і з Беларусі выйшла ня мала выдатных пісьменьнікаў, паэтаў і вучоных, што аддалі свае сілы ці Польшчы ці Расеі.

Гэтакі парадак, створаны труднай гісторыяй, без сумненьня зьнядужаў моц нацыянальнага руху беларусаў, ня маючых пакуль магчымасьці пахваліцца поўнай аднастайнасьцю нацыянальнай думкі.

Але усё нацыянальны беларускі

---

*) Гл. №№ польскіх віленскіх газэт, надрукаваўшых ня дужа даўна гутарку з літоўскім пасланцом у Варшаве п. Шаулісам Адказ за падобныя цьвёрдыя даводы кладзецца агулам на п. Шауліса.

рух расьцець, асабліва дзякуючы падзеям цяперашняга часу, і недалёчка пара, калі народ беларускі, пасьля усіх злыдняў далёкай прошласьці і цяперашчыны, прахапіецца, што толькі ўласнаю рукою і ўласным розумам ён зробіцца гаспадаром у сваёй хаце, а не батраком.

У суседніх з Польшчаю і Літвою мясцовасьцях нацыянальнае пачуцьце беларусаў і цяпер даволі разьвітае. І мы, беларусы, не баімся зрабіць прапазыцыю спорачым, каб разьвязаць пытаньне аб належнасьці той ці іншай спрэчнай паграпічнай паласы способам плебісцыта (народнага галасаваньня). Мы надта пэўны ў тым, што віленскія беларусы, мяжуючыя з ліцьвінамі, ня скажуць, што яны ліцьвіны, а гродзенскія беларусы, мяжуючыя з палякамі і ліцьвінамі, ня скажуць, што яны палякі ці ліцьвіны. Магчыма, ведама, што, калі ня будуць захованы пры галасаваньню патрэбныя гарантыі вольнасьці, дык выйдуць падтасаваныя рэзультаты, шкодныя для беларусаў.

Значыцца, мы, беларусы, гатовы пайсьці да тых, хто хоча ужо цяпер лічыць Вільню з землямі і розныя другія спрэчныя месцы нашага краю ці польскімі ці літоўскімі, з прапазыцыяй скончыць спор так, як скажа насяленьне спрэчных мясцовасьцей. Даволі аннексіоністкіх і ўсялякіх іншых авантур.

Калі палякам ці ліцьвінам удасца способам плебісцыта дайсьці прылучэньня Вільні з землямі да Польшчы ці Літвы, дык мы, беларусы, ня гледзячы нятое, што Вільня усягды знаходзілася і цяпер знаходзіцца на Беларускай тэрыторыі, згодзімся з фактам, але мы ведаем, што навет калі будзе верх палякоў у Вільні і яе землях, нельга будзе прылучыць гэтыя мясцовасьці да Польшчы, калі гродзенскія беларусы і ковенскія ліцьвіны, аддзеляючыя Вільню ад Польшчы, ня згодзяцца аддацца пад Польшчу. Верху ліцьвіноў у Вільні і яе землях мы саўсім не спадзяёмся, бо ліцьвіноў у Вільні і яе землях надта мала.

Дзеля таго мы спакойна пазіраем на польска-літоўскія сьпіраньні за Вільню. І тым і другім мы даём добрую раду: меней гаманіць аб сваіх правох на Вільню і яе землі, бо калі пытаньне будзе разьвязана плебісцытам, дык гоман не паможа, калі-ж — сілаю, дык аб чым гаманіць?

Але, быць можа, магчыма згода паміж спорачых бяз плебісцыта. У гэткім выпадку і Польшча і Літва павінны пакінуць клопат аб павялічаньню сваіх абшараў на рахунак Беларусі і лічыцца з усё дужэйшым голасам беларускага народу аб сваёй непадзельнасьці і дзяржаўнай самастойнасьці. *К.*

Вольная трыбуна.

Беларусы і ліцьвіны.

Прадстаўнікі літоўскай Тарыбы паехалі у Варшаву, каб абгаварыць варункі будучых літоўска-польскіх адносін.

У газэтах чытаем цікавыя весткі аб паглядах ліцьвіноў. Вось што яны кажуць:

„Згодна з пажаданьнямі і кіраваньнямі літоўскага народу, пастанавілі мы працаваць дзеля адбудаваньня літоўскага гасударства, якое складаецца глаўным чынам з быўшых губэрняў: Ковенскай, Сувалкскай, Гродзенскай і Віленскай за выняткам мейсцовасьцей, лежачых на вусход ад возера Нароч, у каторых жыхары, як праваслаўныя, больш прыбліжаюцца культурна і традыцыйна да Расеі, чымсьці да Літвы“.

Апрача гэтага, ліцьвіны выставілі яшчэ адно дамаганьне: „Найбольш важным і найбольш катэгарычным нашым варункам ёсць прызнаньне незалежнасьці літоўскага гасударства са сталіцаю у Вільні. Без наперадняга прыняцьця гэтаго варунку ня можам зусім прыступіць да перагавораў дзеля польска-літоўскаго паразуменьня“.

Вымаганьня ліцьвіноў, каб Віленская і Гродзенская губэрні былі цалком прылучаны до Літвы, мы уважаем несправядлівымі.

З Віленскай і Гродзенскай губэрняў могуць быць аддадзены Літве толькі тыя часткі, дзе селяне чыстыя ліцьвіны і гавораць па-літоўску.

У справах выдзяленьня тэрыторыі такому чы сякому народу перад усім павінен іграць глаўную ролю прынцып этнаграфічны. За гэтым толькі прынцыпам могуць ісьці прынцыпы гістарычныя, культурныя і эканамічныя.

Што датыча места Вільні, справа вельмі спорная. Бадай што у Вільні лікам сваім пераважаюць жыды, затым ідуць палякі, беларусы і ліцьвіны. Паводлуг нашых гістарычных досьледаў, Вільня ніколі ня была чыста ліцьвінскім местам, бо ліцьвіны ніколі у ёй ні пераважалі сваім лікам. Аснавацель Вільні вялікі князь Гедымін, будуючы места, вызваў рамесьнікаў немцаў, даў ім правы і асобныя прывілеі, так сама, як і жыдом, апрача гэтага прыказаў сяліцца у Вільні беларусам і палонным палякам, каторых многа ён набраў, ваюючы з Польшчай. Вільня заўсёды была напоўнена мешанай люднасьцю.

У XIV, XV і першай палове XVI сталецьця культурна у Вільні пераважаюць беларусы. Першыя друкарні Францішка Скорыны, Бабіча, Мамонічоў былі беларускія і вось дзеля гэтай культуры Вільня заўсёды будзе дарагой сэрцу кожнага беларуса.

З XVI сталецьця бярэ верх польская культура, затым пачынаючы с конца XVIII сталецьця пачынаецца руйнуючы уплыў маскоўскай культуры, якая нічога не будуе, адно ніштожыць усё цэннае, здабытае працаю цэлых сталецьцяў.

Дзеля усіх такіх прычын Вільня павінна быць местам, дзе спатыкаліся бы ўсе нароіды, разглядалі усе справы, пастанаўлялі бы такую або іншую палітычную фэдэрацыю — адным словам надавалі-б кірунак палітычнаму суседзкаму жыцьцю.

Толькі такое вырашэньне спорнага пытаньня можа даць братнюю згоду і

ПАМЯТКА.

(Гл. № 7).

Ад 1793 г да 1905 г. вышлі толькі два-тры выданьні ў беларускай мове, і хаця пасьля першай расійскай рэвалюцыі ў 1905 г. абмежаваньні для друку былі скасованы, але расійская улада дакладала ўсіх стараньняў да таго, каб умацаваць за сабою Беларусь шляхам прышчапленьня велікарускай культуры. Ня гледзючы на страшэнны гвалт і прыгняценьне, думка аб культурна - нацыянальнай і дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі ніколі ня умірала сярод беларускага грамадзянства. У пачатку праміпулага сталецьця культурна -нацыянальны рух набірае организованага характару і пачынае хутка расьці і пашырацца. Нездавальненьне расійскім панаваньнем узмацняецца і выбухае ў паўстаньнях, каторыя адбіліся з асаблівою сілай на Беларусі ў 30 і 60-х гадох праміпулага сталецьця. Уцалелыя паўстанцы з паміж інтэлігэнцыі, адхінаючыся ад Масквы, аканчацельна пераходзілі на бок паднявольнай Польшчы і гінулі для беларускага народу ў польскай культуры, але стагнаўшы ў няволі народ высылаў на змаганьне за сваю самабытнасьць усё новых і новых людзей. У 80-х гадох пачынаецца чыста дэмакратычны рух процiў расійскага панаваньня. Рух гэты пашыраўся спачатку сярод народнай массы ў форме культурна-нацыянальнага адраджэньня. Утварылася новая беларуская літэратура і периодычны друк, пазакладаліся організацыі нацыянальныя, эканамічныя, а нарэсьце і палітычныя. Дзеля характарыстыкі гэтага культурна-нацыянальнага руху можна паказаць на істнаванне гэтакіх органаў друку, як „Наша Ніва“, „Наша Доля“, „Беларус“, „Маладая Беларусь“, „Саха“, „Лучынка“, „Раніца“, „Гоман“, „Крывічанін“, „Крапіва“, „Вольная Беларусь“, „Беларуская Рада“, „Беларуская Зямля“, „Беларускі Шлях“,—што выходзілі на Беларусі на працягу апошніх год, і — „Сьветач“, „Дзянніца“, „Бѣлорусское Эхо“, „Бѣлоруссы въ Одессѣ“, што выдаваліся і выдаюцца па-за межамі Беларусі. Пазаклад алі беларускія выдавецтвы, як „Мінчук“, „Палачанін“, „Наша Ніва“, Загляне сонцо і ў наша ваконцо“, „Вольная Беларусь“ і шмат якіх іншых. Дзеля таго, што каталіцкая часьць беларусаў звыкла праз касьцёл да латынскага друку, а праваслаўная—да кірыліцы, беларускія кніжкі і газэты друкаваліся і тым і другім шрыфтам. Зьявіліся пісьменнікі і поэты, каторыя зрабілі бы славу любой літэратуры, як Якуб Колас, Тарас Гушча, Максім Багдановіч, Максім Гарэцкі, Янка Купала, Ясакар, Зьмітрок Бядуля, Алесь Гарун, Антось Галіна, Захар Вехаць, Канстанцыя Буйла, Ядвігін Ш., Альбэрт Паўловіч і шмат іншых.

Але „конституцыйная“ Расія пасьля 1905 г. не давала Беларусі ніякіх іншых правоў, апрач права друкаваць кніжкі і газэты у беларускай мове. Закон забараняў навучэньне па-беларуску ў пачатковых школах, беларускія бібліотэкі мусілі быць патаемнымі. Забаронена было чыноўнікам трох міністэрстваў (ваеннага, духоўных спраў і народнае прасьветы) падпісывацца на беларускія часопісі, або адтрымліваць беларускія кніжкі. Пры конституцыйным расійскім урадзе прымусовае абрусеньне практыкавалась старана і упарта, дзякуючы ўсяму дзяржаўнаму мэханізму і вялікім выдаткам, робленым на гэта. Беларускія настаўнікі, зрабіўшыя хаўрус, каб адваяваць права

што за гэтым ідзе — дабрабыт, багацьце і счасьце.

Юры Олельковіч.

З польскіх газэт.

Мы ня раз адгукаліся на праявы дэмакратычнай толерантнай польскай думкі.

Цяпер хочам адказаць колькі слоў нейкаму пану С. Богорыя, які у «Dzienn. Wileń.» (№ 19-11 мая) у стацьці «Польская Беларусь» піша надта многа няпраўды.

Пачынаць спрэчку з „Dzien. Wil.“ уважаем за лішняе. Адзначым толькі вось што. Клерыкальна-эндэцкая газэта піша:

„Цяпер беларускаму руху, калі гэта можна назваць рухам, прыйшлі у помач паны, якія у час вайны уцяклі ў Расею, як царскія слугі, а цяпер вярнуліся ізноў да нас“.

На гэта адкажам, што Бог сьцярог нас ад „памагачых“, якіх мы шануем таксама, як і ксяндзоў з „Dzien. Wil.“.

Праўда, ёсьць сьвядомыя беларусы і сярод праваслаўнага духавенства, але „Dzien Wil.“ на гэты раз папаў пальцам у неба. Дададзім што ёсьць „трошку“ і сьвядомых беларусаў ксяндзоў, але канапка „Dzien. Wil.“ будзе для іх помала.

Далей гаворыцца:

„Да дзеяльных агітатараў беларускага руху належаць і ліцьвіны“...

Вось дзякуй за навіну! А мы й ня ведалі, што у нашай прапашчай справе гэтулькі агітатараў. Чаму толькі німа нічога аб „жыдоўскай інтрызе“, як некалі папікалі нас інтрыгаю польскаю ці расейскаю? Бо некаторыя жыды, лепшыя за некаторых хрысьціян, таксама „агітуюць за нас.

Аб першых адозвах у Вільні польскай улады „Dzien. Wil.“ піша:

„Даводзтва і тымчасовая ўлада, якая прыехала ў Вільню, зьдзівавалі жыхароў [illegible] места і ваколіц, калі сказалі аб праграме уніі, аб будучых формах праўленьня, аб Вільні, як сталіцы вялікае Літвы“...

Але. Гэтакія словы дзіву даюцца для „Dzien. Wil.“, але яны ня дзівяць лепшую здаровую частку польскага грамадзянства, як ня зьдзівяць кожнага запраўднага грамадзяніна гэтага краю, бяз рожніцы, ці гэта беларус, ці ліцьвін, ці жыд, ці паляк.

Апошнія навіны.

Што дзеецца у Менску?

Як нас паведамляюць уцекачы, у Менску бальшавікі сіламоц змабілізавалі пагалоўна усё мужчынскае насяленьне ад 17 да 45 гадоватага веку.

Сем'і чырвонаармейскіх ахвіцэраў абвешчаны закладнікамі, каб ахвіцэры ня ўцякалі з фронта.

Ніхто ня ймець веры, каб Менск удзержыўся у бальшавіцкіх руках.

Народны банк (з Падгорнай вуліцы) эвакуіраваны.

Каталіцкая духоўная кансісторыя часова ня робіць.

Настаяцель кафедральнага праваслаўнага сабора і частка духавенства хаваюцца сярод парахвіян.

Дарагоўля павялічваецца; хлеб часам даходзіць да 18—20 рублёў за хунт.

Сярод чыгуншчыкаў перапуд: іх падазрываюць у контр-рэвалюцыйнасьці.

Ці праўда, ці не — польскія конныя ужо саўсім недалёчка ад Менску.

Беларускі полк.

Нас просяць напісаць у газэці, што беларускі дзеяч палкоўнік Езавітаў рушыў свой полк на Менск, каб увайшлі туды беларускія войскі. Па дарозі полк мае павялічывацца жаўнерамі-беларусамі.

Напад на Падэрэускага.

У нядзелю раніцай быў у Варшаве на вакзале напад на прэзэса польскіх міністраў Падэрэўскага, прыехаўшага на колькі дзён з Парыжа. Напад не ўдаўся. Арыштавалі двох людзей, прыналежных —як думаюць—да камуністычнае партыі. (»Nasz Kraj»).

Мірная умова.

У мірнай умове тысяча параграфаў. Яе ня будуць абгаварываць з немцамі, але зажадаюць ад немцаў, каб яны свае думкі сьпісалі на паперы. Калі-б аб усіх параграфах мірнае ўмовы пачалі раіць і дзеля кожнага параграфу патрацілі толькі адну гадзіну, дык аб гэтым трэба было-б гутарыць чатыры месяцы.

Нашы быўшыя апякуны.

У бальшавіцкай газэце „Минский Пролетарий“ напісана, што у Менск прыехалі гэтакія сябры савецкага ураду Літвы і Беларусі: Міцкевіч - Капсукас, Ціхоўскі, Калмановіч, Браноўскі - Вайнштэйн, Багуцкі, Ольдак, Далецкі, Закс, Кнорын, Бобіньскі ды інш.

Напад на коаліцыйную місыю

Аб нападзе нямецкіх салдатаў на коаліцыйную місыю ў Коўне, аб чым мы ўжо пісалі ў № 7 нашае газэты, паўтараючы словы газ. «Nasz Kraj», апошні нумар „Nepriklausomoji Lietuva“ піша: „7 мая а 6 гадз. ў веч. каля 1000 нямецкіх салдатаў зрабілі сход. Пасьля, ня гледзячы на загад нямецкіх афіцэраў, якія казалі салдатам, каб былі ціха, яны зрабілі деманстрацыю. Затрымаўшыся перад гасьцініцай „Мэтрополь“ салдаты пачалі крычаць, а іншыя навет уварваліся ў гасьцініцу, але афіцэры перашкод-

ужываць роднае мовы ў пачатковых школах, былі засуджаны ў вастрог, або ў Сібір на засланьне, а некаторыя з памянёнаго настаўніцкага хаўрусу паўцякалі ў Амэрыку.

Да апошніх часоў вясковая палітыка расійскай дзяржавы старалася засяляць Беларусь велікарусамі, выхадцамі з Маскоўшчыны. Беларусам-каталіком забаранялася куляць на Беларусі зямлю, займаць урадавыя пасады і закладаць ананімныя таварыствы. Пры выбарах ў Дзяржаўную Думу беларусы не маглі пасладь туды сваіх прадстаўнікоў, дзякуючы асаблівай выбарнай сыстэме, прыдуманай сьпецыяльна для Беларусі. Калі выбухла сусьветная вайна, то расійскі урад ухваліў сыстэму помачы пацярпеўшым ад вайны па нацыянальнасьцям: ён удзяляў значную помач усім іншым нацыянальнасьцям бьўшай Расіі, выключыўшы толькі беларусаў, а так сама украінцаў. У гэтым жа часе расійскі урад эвакуаваў з роз ых мейсц Беларусі сотні тысяч беларускіх сялян, нішчыў хлеб на палёх, паліў хаты і гумны; адступаючая расійская армія гнала перад сабою людзей, як быдла, ў варунках самых цяжкіх і негігіенычных аж у самую наўночную Расію і Сібір. Частка жыхароў засталася ў сваіх сядзбах дзякуючы адно таму, што іх вёскі ляжалі па-за межамі фронту, або дзякуючы таму, што загадзя пахаваліся ў лясох і балотах.

Калі лютым пераваротам 1917 г. былі зруйнаваны муры маскоўскага царызму і апалі кайданы палітычнай няволі, дык распачаты ў 80-х гадох прошлага стальцьця культурна-нацыянальны рух беларусаў адразу набраў палітычнага значэньня. Пачалі закладацца беларускія палітычна-нацыянальныя арганізацыі, як па усёй Беларусі, так і па-за межамі яе, куды параскідала вайна беларусаў. Уваскросьлі гістарычныя традыцыі, паўстала праміну лая слава і магутчасьць беларускай дзяржавы, і ідэя аднаўленьня дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі ў складзе быўшага Вялікаго Княства Беларуска-Літоўскаго пачала набіраць характер рэяльнасьці. Усе політычныя нацыянальныя арганізацыі злучыліся увосень 1917 г. ў першым агульна нацыянальным прадстаўніцтве—у Вялікай Беларускай Радзе. Умацаваўшы свае пазыцыі ў сэнсе прыдбаньня агульнаго народнаго спачуцьця, выяўленаго ў многачысьленых дэлегацкіх рэзалюцыях з усіх мейсц Беларусі, Вялікая Беларуская Рада склікала 5-17-го сьнежня (ст.ст.) 1917 году ў м. Менску Усебеларускі Зьезд. Гэты Зьезд з поўнасьцю адбіваў волю беларускага народу. На ём было 1167 дэлегатаў з пастанаўляючым і 705 з дарадчым голасам ад валасных, паветавых, губэрнскіх самаспраўаваньняў і ад розных вайсковых арганізацыяў. Зьдзяйсняючы права беларускага народу на самаакрэсьленне, Усебеларускі Зьезд устанавіў у межах Беларусі краёвую рэспубліканскую ўласьць і перадаў яе сваёй Радзе Зьезду. Збройны разгон Зьезду бальшавіцкімі камісарамі ня даў магчымасьці закончыць работы, а Рада Зьезду, меўшая ўзяць краёвую ўласьць у свае рукі, прымушана была хавацца ад бальшавіцкага прасьледаваньня, каторае тэрорызавала ўсё маёмасное жыцьцё і асабліва беларускія організацыі.

Язэп Л—к.

(Далей будзе).

зілі імісьці далей у пакоі. У гэты час зьявіўся Генерал Камэндант усходняга нямецкага фронту і пачаў намаўляць салдатаў, каб былі ціха ды йшлі да хаты, але яго асьвісталі. Адзін з немцаў хацеў кінуць бомбу, але іншыя бомбу ад яго адабралі. Да 10 гадз. у веч. нямецкія салдаты крычалі перад гасьцініцай, пасься пайшлі дамоў".

Дзе беларускі грамадзянін А. О. Карабач?

6-га мая быў арыштаваны палявой жандармэрыяй шырока вядомы сярод пачтовых работнікаў беларускі грамадзянін А. О. Карабач.

Калі была пададзена папера ад Пачтоваго Вокруга аб тым, што ён не камуніст, яго 8-га мая выпусьцілі.

Таго ж дня ён пайшоў у контр-разьведку па свае дакумэнты, але таварыш, каторы астаўся на вуліцы, ужо яго адтуль не дачакаўся.

Пасьля гэтага гр А. О Карабач дамоў не прыхадзіў.

На спраўку у контр-разьведцы далі адказ, што за імі арыштаванага А. О. Карабача ня лічыцца

На спраўку у палявой жандармэрыі далі адказ, што гр. А. О. Карабача выпусьцілі.

Ня гледзячы на ўсе розыскі, саслужыўцы А. О Карабача дагэтуль не знайшлі яго і зьвярнуліся з заявай у Беларускую Раду.

Аднак, як ведама, Віленская Беларуская Рада яшчэ ня мае магчымасьці безпасярэдне зносіцца са спаўняючым органам Рады Беларускай Рэспублікі і п. Начальнікам Юзэфам Пілсудскім.

Шчэзнавеньне гр А. О. Карабача, як сьвядомага беларуса і ведомага грамадзкага працаўніка, вельмі ўстрывожыла і занепакоіла беларускія колы.

Беларускі дзеяч Ян Станкевіч выпушчаны яшчэ ня выпушчаны.

¿Браць бяруць, а ці дадуць?

Генэральны камісар „Усходніх Земляў" заявіў, што польскі урад ніякіх абавязкаў бальшавіцкай ўлады, як безпраўнай і напаўшай на наш край, на сябе ня прыймае.

І дагэтуль ня чуваць, каб польская ўлада дапамагла як-кольвек б. савецкім служачым і наагул галадаючым работнікам, што цяпер ня маюць а ні грошы, і ні працы.

Тымчасам польская ўлада вымагае, каб усякі, хто мае бальшавіцкія грошы, дадзеныя яму на выплату пэнсій служачым ці на што падобнае, каб ён аддаў гэныя грошы ёй, польскай ўладзе.

Кудой жа пайдуць гэтыя грошы?

Бо, дапраўды, дзіўна: калі мы жылі ня ў „Усходніх Землях", а ў Беларуска-Літоўскай Рэспубліцы і ня былі „роўнымі" і „вольнымі", а мучаліся над дыктатурай псеўда-пралетарыята, дык талы мы хаця і чулі аб „безпраўнасьці і нападах" *з другога боку*, належныя нам за працу грошы аднак даставалі.

І хто-ж ня ведае, што большасьць людзей служылі у бальшавікоў, каб толькі ня памерці з голаду?

Дык чым жа гэтакія вінаваты?

Ці ж гэта час *цяпер* рабіць на прыказцы: паны дзяруцца, а ў хлопаў чубы трашчаць?

Харчы.

Выдача харчоў.

Як кажуць у Магістраце, прадстаячы майскі паёк насяленьню (пш. мука, цукар, соль і саланіна) мае быць павялічан яшчэ кансэрвамі.

Выпадае пажадаць, каб выдача пайка адбылася, як дэкляравалі, на гэтым тыдню.

Хлебная цана.

У прыватнай продажы хлебная цана абнізілася да 9½ 10—рублёў за хунт, але далей не зьменшаецца ўжо пяць дзён.

Можна спадзявацца, што цана спадзе, калі насяленьню выдадуць майскі паёк (12 хунтаў пш. мукі на душу).

Беларуская народная кухня.

На Юраўскім прасп., д. № 22 (дзе гасьц. „Брыстоль") адчынілася белар. нар. кухня. Запіс сталаўнікоў прыймаецца з учорашняга дня.

Бульба.

Прывезена у Вільню 30 вагонаў бульбы. Колькі для грамадзянскага насяленьня, пакуль што не памяркована.

КРОНІКА.

Дармовая прышчэпка воспы.

У амбулаторыі „Озе" (Вялікая Пагулянка, д. № 15) у нядзелі, серады і суботы ад 11 гадзіны раніцы да 1 гадзіны дня рабіцца дармовая прышчэпка воспы.

Міліцыя.

У м. Радашкавічы афіцыяльна назначана польскаю ўладаю міліцыя.

Лясы.

Польская ўлада пастанавіла не дазваляць пакуль што продажы лясоў у маёнтках

Перапускі.

Выдача перапускоў у бок Менска, як мы павядомлены з добра - ведаючай крыніцы, добра калі пачнецца на тым тыдню, але не раней.

Да ведама падарожных.

Урад віленскага жалезнадарожнага вузла паведамляе, што чыгунка будзе перавазіць публіку і рэчы толькі паводле магчымасьці, як пазволяць на гэта вайсковыя справы. Пакуль што білеты прадаюцца толькі да станцыяў Вільня-Ліда. Трэба мець пазваленьне ад вайсковай улады.

Юстыцыя.

Польская ўлада арганізавала сьпецыяльную юрыдычную камісію дзеля выпрацоўкі і кодыфікацыі грунтаў вокружнай, павятовай і сельскай міравой юстыцыі.

Рэгістрацыя.

У дадатак к загаду аб заяўцы дамаўласьнікамі і домовымі упраўляючымі б. камісараў, чырвонаармейцаў, ахвіцэраў, чыноў нямецкай арміі і усіх наагул б. савецкіх працаўнікоў, — мае быць яшчэ ад палявой жандармэрыі разсылка кождаму з іх іменных анкетак — якую меў службу, якога веку, стану, роду і г. п.

У магістраце.

Ідзець падгатоўчая работа па стварэньню найбольш патрэбных камісіяў, адпаведаючых духу б. гарадзкіх упраў: па народнай прасьвеце, гаспадарскай, грашовай, кіраўнічай і г. д.

Бульба для пасеву.

Управа г. Вільні паведамляе, што 14 і 15 мая будуць прадаваць бульбу на семя арандатарам гародаў, якія ёсьць пад апекай сэкцыі пакінутых дамоў, і 16 мая — гаспадарам або арандатарам прыватных гародаў. Каб купіць гэтую бульбу для пасеву, для І і ІІ катагорыі патрэбны ўмовы або квіток адпаведнай установы, для ІІІ катагорыі— пасьвядчэньне, што бульбу ўжывуць для пасеву. Выдаваць бульбу будуць у складзе Тышкевіча на Стэхванскай вул.

Сярод праваслаўнага духавенства.

Епархіяльным праваслаўным упраўленьнем абмяркована на бліжэйшыя дні абкругленьне іншых паветаў епархіі у зьвязку з адходам бальшавікоў.

Некаторыя з усходніх парахвій, зашкоджаныя акупацыяй, будуць ужо рэстаўрываны.

Пытаньне аб пэнсіі духавенству з казны таксама стаіць на чародзе дня.

Аддача грошы.

Разьлеплены абвесткі аб тым, каб усе б. служачыя савецкай улады, каторыя маюць якія-кольвек грошы ад савецкіх установ на выплату пэнсій ці на страты іншага падобнага характару, аддалі іх да 18-га мая разам з рахункамі у Камісарыят места (Дамініканская 3, пакой 33, ад 9—12 гадзін у дзень.

Кярэнкі і думскія.

Гэтых грошы на тутэйшых рынках і кірмашах, а таксама у страўнях дагэтуль не бяруць.

Бадай што пара ужо выдаць новы загад аб грашах, каб сьпекулянты пазьмірнелі, а страўні каб мелі магчымасьць прыймаць абы-якія грошы.

Цэны на кватэры.

Магістрат мае выдаць загад процІў дамовых і кватэрных гаспадароў-сьпекулянтаў, карыстаючых з перамены ўлады.

Пішы у „Беларускую Думку" аб сваіх патрэбах і жаданьнях, а злашчы крыўдах. Пішы у той мове, у якой гаворыш

Рэдактар і выдавец **У. Знамяроўскі** Друкарня „Прамень", Ігнатаўскі, 5.